

Жыве Беларусь!

Народная Газета

Орган Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

№65 (1082) 6 красавіка 1995 г. Чацвер. Выдаецца з кастрычніка 1990 года на беларускай і рускай мовах. Тыраж 533805 экз. Кошт у розніцу — 150 руб.

ФАКС

*ФАКТЫ*АРГУМЕНТЫ*КОММЕНТАРИИ*СОБЫТИЯ*

Вкратце

Со взятием городов Гудермес и Шали активные боевые действия федеральной армии в Чечне фактически прекращены, заявил начальник Генерального штаба Вооруженных Сил России генерал-полковник Михаил Колесников.

Он сказал также, что в Чечне не осталось крупных очагов вооруженного сопротивления федеральным частям.

❑

Национальный церковный собор Армянской апостольской церкви избрал 131-м католикосом всех армян католикоса Киликийского Гарегина II, в миру Ншан Саркисян.

Предыдущий патриарх Вазген I умер в возрасте 86 лет 18 августа 1994 года.

❑

259 выведенных из состава Тихоокеанского флота России боевых кораблей будут проданы на слом в Южную Корею.

Среди них — большие авианесущие крейсеры "Минск" и "Новороссийск", большие противолодочные корабли "Адмирал Захаров" и "Чапаев", 93 вспомогательных судна и 39 подводных лодок, в том числе 6 атомных.

❑

Курс российского рубля по отношению к доллару США на торгах Московской межбанковской валютной биржи 5 апреля снизился на 16 пунктов до 4936 рублей за доллар.

Перерегистрация партий близится к концу

В соответствии с постановлением Верховного Совета Республики Беларусь "О введении в действие Закона "О политических партиях" до 1 апреля текущего года все партии, которые действовали на основании старого закона, должны были подать документы на перерегистрацию.

Как сообщили корреспонденту агентства РИД в Министерстве юстиции Беларуси, с этой процедурой политические организации справились успешно, но новые свидетельства получили всего 18 партий. Документы остальных восьми пока находятся в стадии рассмотрения. Отказа в перерегистрации еще не получил никто. Всего сегодня в Беларуси, по сведениям Минюста, официально действует 34 партии.

Юрий ЛЕШКЕВИЧ.

Миллиарды, заработанные умом

В прошлом году в народном хозяйстве страны было использовано 345 разработок учреждений Академии наук Беларуси.

Внедрение технологических процессов, новой техники и материалов, практических рекомендаций велось по 1653 договорам на создание научно-технологической продукции и 105 договорам о научно-техническом сотрудничестве. Из них более 1000 договоров на создание научно-технической продукции уже выполнено, и объем их составил более 9 млрд. рублей. Наибольший объем разработок приходится на Институты технической кибернетики (более 1,4 млрд. руб.) и тепло- и массообмена (более 1,1 млрд. руб.).

Александр ЮРИН.

Связь до коммунизма не "дотянула"

Со 2-й декады апреля в Витебске отменяется "телефонный коммунизм": городской бюджет больше не в силах отдавать связистам ежемесячно по 10 млн. рублей за это "удовольствие".

Последние уже заканчивают переделку монетоприемников уличных аппаратов под жетоны ценой 450 рублей.

Александр ТУЛБУСОВ.

Пошли суда по рекам

На реках, протекающих по территории Гомельщины, началась навигация.

Несмотря на серьезные проблемы, которые стоят перед тружениками голубых магистралей, пошли в порты назначения первые грузовые суда. Они везут деловую древесину в Речицу и Светлогорск, строительные материалы — в Жлобин и Рогачев. А владельцев садово-огородных участков в верховье и низовье Сожа в этом году будет обслуживать комфортабельный двухпалубный теплоход "Минск".

Леонид ВЛАДИМИРОВ.

Милиция стережет и ночью

Спокойней стали себя чувствовать в ночное время на улицах города жители Житковичей.

Подобное бесстрашие объясняется тем, что местная милиция перешла на двухсменный режим работы: 30 процентов ее сотрудников работает в ночную смену. Как показали первые дни такой работы, в городе уменьшилось количество случаев воровства и ограблений в ночное время.

Надежда ЗАРЯНКА.

Кто хозяин магистрали?

— Мы! — ответили на этот вопрос работники Оршанского райотдела милиции, "оседлав" автостраду Москва—Брест в пределах своего района с помощью специального участка дорожной службы.

Результат налицо: с начала нынешнего года на самой оживленной трассе Витебщины зарегистрировано всего три преступления. Год назад таких ЧП за январь—март было раза в три больше.

Однако "вкус победы" горьковат: усиление патрульно-постовой деятельности на магистрали достигнуто за счет "внутренних резервов", иначе говоря, прибавив сил в борьбе против бандитов с большой дороги, пришлось убавить число сотрудников, занятых на других участках района.

Сергей ДНЕПРОВ.

В лесу под Осиповичами

Страшная находка обнаружена в лесу под Осиповичами: труп мужчины без головы. На шее виден след от удавки. Одет — вплоть до белья — в "фирму".

Почерк преступления весьма похож на действия группы рецидивистов, которая орудует в разных регионах Беларуси, промышляя захватом и продажей автомобилей. Прежде, чтобы труднее было установить личность жертв, в ход пускали кислоту. Бандиты вооружены и в среде уголовников не раз заявляли, что "ментам сдаваться не будут". Их ли рук убийство под Осиповичами — покажет следствие.

Николай ТОЛСТИК.

Выпуск подготовлен по сообщениям корреспондентов "Народной газеты", агентств ИТАР—ТАСС, Интерфакс, Белинформ, БелаПАН, РИД.

БЕЛАРУСЬ. Год 1995-ы





❑ *Кожны ідзе ў рынак па-свойму. Адным — густа, другім — пуста.*

Фота Сяргея ГРЫЦА.

СУД ДА ДЕЛО

Как Иван Иванович пытается "нокаутировать" Сергея Антоновича

Алесь СИВЫЙ

Судебная тяжба между управляющим делами Президента Беларуси Иваном Титенковым и депутатом белорусского парламента Сергеем Антончиком, похоже, еще не закончилась.

На днях в редакцию поступило любопытное сообщение, распространенное управлением общественно-политической информации Администрации Президента Беларуси. Позволю его процитировать: "Управление общественно-политической информации Администрации Президента Республики Беларусь сообщает, что очередное и последнее заседание суда Ленинского района г.Минска закончилось полным поражением депутата С.Антончика, который обвинил в своем нашумевшем докладе управляющего делами Президента Беларуси Ивана Титенкова в так называемых фактах коррупции. Политика Белорусского народного фронта, направленная на дискредитацию Президента и его окружения, потерпела очередной провал. С учетом того, что на господина Антончика готовятся еще, как минимум, три десятка исков от граждан по защите своих чести и достоинства, остается только сочувствовать народнофронтовцам в неудачно разыгранном спектакле накануне выборов в Верховный Совет. Кроме политического проигрыша С.Антончику и его сторонникам по БНФ придется выплатить многомиллионную сумму за нанесенный моральный ущерб служебным лицам. Что же, популярность стоит дорого, тем более если она далека от правды и реальной действительности".

Не касаясь политической подоплеки этого документа, наш корреспондент попросил высказать свое мнение о процессе Сергея Антончика.

— Сергей Антонович, вы можете прокомментировать решение суда?

— Во-первых, нарушены мои конституционные права. Я выразил недоверие суду и не присутствовал на его заседаниях, кроме одного, — это два. Доклад я писал от своего имени, а не от имени БНФ — три.

— Вернемся назад. Какие конкретно ваши конституционные права были нарушены?

— Я не должен нести юридическую ответственность за свою деятельность в Верховном Совете. Ну да ладно. Я подал 22 ходатайства с тем, чтобы суд запросил источник моей информации. Все бесполезно.

— Вы намерены подавать кассационную жалобу?

— Да. Я подаю кассацию в городской суд.

После этого разговора я позвонил судье, которая выносила решение по делу "Титенкова — Антончика" Любови Васильевне Жолнерчик. Вот что она рассказала:

— Господин Антончик действительно заявлял отвод суду, но последний был отклонен как необоснованный. Суд в соответствии с законом решил возможным продолжить слушание дела в отсутствие ответчика.

— Каково решение суда?

— С.Антончик должен выплатить И.Титенкову 200 миллионов рублей.

P.S. Точка в этом деле пока не поставлена, так что подождем.

Мечыслаў Грыб не збіраецца пакідаць Вярхоўны Савет

У апошні час у кулуарах парламента, ды і іншых высокіх установ, многа гаварылася аб магчымым пераходзе Старшыні Вярхоўнага Савета Беларусі Мечыслава Грыба на дыпламатычную работу. Называлася нават і новае месца работы — прадстаўнік Беларусі ў ААН.

Аднак сам спікер на праведзенай вечарам 4 красавіка прэсканферэнцыі, прысвечанай візіту ў нашу краіну польскіх парламентарыяў, заявіў наступнае: "Афіцыйных прапаноў аб новым месцы работы, у тым ліку і аб назначэнні на дыпламатычную, мне не паступала". Паводле слоў Мечыслава Іванавіча, ён будзе рабіць усё, каб дапрацаваць да канца тэрміну на пасадзе Старшыні Вярхоўнага Савета рэспублікі.

Ігар РУБАН, Белінфарм.

Почем валюта?

С 5 апреля 1995 года Национальным банком установлены курсы иностранных валют

	Единый курс
1 австрал. доллар	8 421.21
1 австр. шиллинг	1 194.37
1 фунт стерлингов	18 554.37
10 бельг. франков	4 085.69
1 немецкая марка	8 404.59
1 голланд. гульден	7 505.06
1 датская крона	2 121.65
100 итальянск. лир	665.51
1 канадск. доллар	8 227.21
1 норвежск. крона	1 868.55
1 доллар США	11 500.00
1 финск. марка	2 677.28
1 франц. франк	2 392.94
1 шведск. крона	1 560.74
1 швейцар. франк	10 283.47
10 японских иен	1 336.28
1 ЭКЮ	15 280.36
10 испанск. песет	909.09
10 греч. драхм	510.09
1 ирландск. фунт	18 563.36
1 исландск. крона	182.37
1 кувейт. динар	39 343.14
10 ливанск. фунтов	70.38
10 португал. эскудо	790.38
1 сингапур. доллар	8 173.42
10 турецк. лир	2.74
1 СДР	17 890.48
1 эстонск. крона	1 041.67
1 росс. рубль	2.30
10 укр. карбованцев	0.82
1 литовский лит	2 875.00
1 латвийск. лат	22 460.00
1 кыргызск. сом	1 055.00
1 молдавск. лей	2 590.00
1 казахст. тенге	150.00
1 армянск. драм	15.00
10 грузинск. купонов	0.01
1 туркменск. манат	150.00
1 азербайджан. манат	1.50
1 узбекский сум	45.00
1 таджикский рубль	0.01

"Белая Русь" сасуды расшырае, але кішэню звужае

На 30 працэнтаў у сярэднім павышана цана на белую гарэлку з 6 красавіка бягучага года. Як паведамілі Белінфарму, такое рашэнне прынята Мінсельгасхарчам і Камітэтам цэн Мінэканомікі па ўзгадненню з Мінгандлем з мэтай ліквідацыі стратнасці вытворчасці лікёра-гарэлачнай прадукцыі і папаўнення дзяржаўнага бюджэту.

З гэтага часу гарэлка "Пшанічная" і "Сталічная" ў бутэльках 0,5 літра ў звычайным афармленні будзе каштаваць з посудам 14700 рублёў, а ў спецыяльным і экспартным афармленні — 15200, гарэлка "Маскоўская і "Руская"—адпаведна 14500 і 15000, "Крышталь-100" — 15500 і 16000 рублёў. І, нарэшце, закрывае асартымент "Белая Русь", цана якой падскочыла да 16100 і 16600 рублёў.

Тэрэза ХАЮЦІНА, Белінфарм.

Восьмой! Восьмой! Ничего не вижу. Прием!

Алесь СВЕТЛАНИЧ

Мы уже сообщали, что с 1 апреля поставлен "на профилактические работы и замену оборудования" минский 8-й телеканал.

Корреспондент "Народной газеты" решил выяснить подробности о событиях вокруг "восьмого", позвонив вначале исполнительному директору АО "МКТ" Петру Черноморцу, а затем — начальнику управления информации Администрации Президента Владимиру Заметалину.

П.ЧЕРНОМОРЕЦ:

— Я разговаривал с представителями Администрации, и мне объяснили, что телеканал будет приостановлен на ремонт передатчика до 3 мая этого года. Ровно на месяц. Плюс нужно перезаключить договор на аренду. Мы, конечно, обращались ранее и обратились теперь в Администрацию с просьбой продлить договор, но... Только после реконструкции.

— Петр Владимирович, вещание 8-го канала приостановили аккурат на время предвыборной кампании. Вы не находите параллелей?

— Чисто формально (по срокам) эти два события можно связать. Официально — не подкопаешься. В Министерстве связи и информатики нам говорят, что нужно получить в Администрации Президента разрешение на аренду передатчика, в Администрации отвечают: разрешение дадим, когда передатчик будет отремонтирован.

В.ЗАМЕТАЛИН:

— На 1 апреля не существует никаких отношений между администрацией 8-го канала и Администрацией Президента, поскольку закончился срок договора. Как только будут проведены соответствующие работы, оформлены соответствующие бумаги, телеканал вновь начнет свое вещание. Какие могут быть проблемы...

АФІЦЫЙНАЯ ХРОНІКА

Граніца— не толькі лінія паміж дзяржавамі

Адбылося пасяджэнне расшыранай калегіі Галоўнага ўпраўлення пагранічных войск Беларусі. У ім прыняў удзел Прэзідэнт рэспублікі Аляксандр Лукашэнка.

Змяніўся сам характар аховы граніцы, падкрэсліў Прэзідэнт. У непасрэднай блізкасці ад нашых рубяжоў дзейнічаюць добра арганізаваныя злачынныя групы, якія імкнуцца, і небеспаспяхова, перапраўляць у суседнія дзяржавы нелегальных мігрантаў, наркотыкі, зброю, каштоўнасці. Усё гэта проста абавязвае пагранічнікаў, як і іншыя зацікаўленыя ведамствы, працаваць па-новаму.

Каменціруючы дагавор аб супрацоўніцтве ў ахове граніц, падпісаны прэзідэнтамі Беларусі і Расіі ў час нядаўняга візіту ў Мінск Барыса Ельцына, Аляксандр Лукашэнка заявіў, што гэта пагадненне ініцыіравана ім пры поўным разуменні і згодзе і без усякага націску з боку Расіі. А дапамога традыцыйна брацкага суседа ва ўмацаванні па сутнасці справы агульных для дзвюх дзяржаў граніц — ва ўзаемных інтарэсах.

Леанід ТРАЦЭЎСКІ, Белінфарм.

Калонка рэдактара

Які ж вынік дасць паляванне за голасам бабы Мані?

Па волі лёсу мне давялося паўдзельнічаць у такой вялікай палітычнай гульні, як вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты. Трапіць у запаветны спіс не пашчасціла, але справа не ў гэтым. Бы ў кампенсацыю за страчаныя выхадныя дні сваімі вачыма пабачыў, як рэагуюць людзі на палітычную мітусню.

Разам з дырэктарам валяльна-лямцавай фабрыкі Васілём Сабаном паспрабавалі правесці сход жыхароў гарадскога пасёлка Смілавічы. Васіль Мікалаевіч — чалавек разумны і паважаны, я палічыў бы за гонар быць у яго даверанай асобай, але сам ён у парламент не рвецца, бо фабрыка працуе, людзі пры добрай зарплаце. А пакінеш фабрыку на адну сесію, потым на другую, хто ведае, як справы пойдуць.

Карацей кажучы, дырэктар агітаваў мяне, а я яго... У такім стане мы і прыйшлі ў актавую залу завочнага тэхнікума, дзе сабралася каля 200 чалавек.

Не варта было б і гаварыць пра эпізод з асабістага жыцця, але на яго прыкладзе можна расказаць пра трывожныя тэндэнцыі ў правядзенні кампаніі.

Неяк смешна чуць і гаварыць пра роўныя магчымасці прэтэндэнтаў. І нават прэзідэнцкі ўказ не выраўняе іх. Ну, скажам, мяне паслухаў і прыехаў у Смілавічы з міні-акардэонам знакаміты Эдуард Ханок. Каму не даспадобы была прамова журналіста, ён мог паслухаць вянок папулярных песень. У мясцовага настаўніка знаёмства з кампазітарам няма, і ён націскаў на тое, што мясцовыя ўлады завалілі ўсё, нават тое, што завaліць немагчыма.

Але маё саперніцтва з настаўнікам — завочнае, дарэчы, бяскрыўдная рэч.

Трывожыць, што так званыя раённыя "вертыкальшчыкі" бяруць на сябе смеласць быць актыўнымі прапагандыстамі і агітатарамі на карысць абранай імі ў цішыні кабінета кандыдатуры.

З якім кіраўніком ні пагутарыш — зверху ўжо растлумачылі, націснулі, маўляў, нам трэба працаваць на аднаго.

Дарэчы, у Чэрвені формы ўлады мяняюцца, а людзі ў крэслах застаюцца тыя ж. Прэзідэнт, відаць, яшчэ адчуе, наколькі апраўданай будзе гэта стаўка. Старшыні райвыканкамаў, адышоўшы ад перапуду пры будаўніцтве "вертыкалі", пачынаюць весці ўласную гульню.

У чым яна? Горка гаварыць пра тыя ж Смілавічы, але хіба можна забыцца пра тое, што з горыччу гаварыла жанчына сталага веку Марыя Гуроўская. Па мясцовых мерках, баба Маня — адмысловы палітык, выпісвае дзве газеты, у тым ліку і нашу. Гатова галасаваць за таго, хто дапаможа адчыніць лазню ў Смілавічах. Так, у цэнтры Еўропы, у цэнтры Беларусі, за трыццаць кіламетраў ад Мінска ніяк не могуць дабудаваць лазню. Дзе тыя санітарныя ўрачы?! Дзе той "вертыкальшчык" Мікалай Глазуноў?! Чаму яны тут не днююць і не начуюць, пакуль баба Маня не дастане венік з-пад страхі, каб прапарыць костачкі?!

Панам начальнікам няма часу. Лазня — гэта дробязь, ад яе лёгка адмахнуцца, знайшоўшы дзесяткі прычын. І так будзе датуль, пакуль ад бруду не з'явіцца дзівосная хвароба, пакуль хто не пачне галадоўку ці не збярэ мітынг...

Чэрвеньскія ўлады шчыруюць, каб яшчэ да пачатку афіцыйнай агітацыі ў кожнага выбаршчыка засела ў вушах адно прозвішча — Ганчарык. Ён малюецца і збавіцелем, і натхніцелем. Зразумела, што агульнымі словамі нікога зараз не падкупіш. І ў ход ідуць абяцанні.

Адзін старшыня калгаса прызнаецца: абяцалі 300 мільёнаў грошай, другому — дабудаваць жылы дом, трэцяму — паліва і таксама грошы.

Старшыня Савета Федэрацыі прафсаюзаў Уладзімір Ганчарык разумее, што яму з трыбун гаварыць пра такія рэчы небяспечна, але ёсць шмат памагатых, якія шчыруюць з раніцы да вечара.

На адно з прадпрыемстваў наведаліся рэспубліканскія начальнікі як па лініі вытворчасці, так і па лініі прафсаюзаў. Вялі гаворку, які харошы чалавек Уладзімір Іванавіч, якую значную дапамогу ён можа знайсці для раёна. Куды там настаўніку з выкрывальнымі прамовамі і журналісту з абяцаннем выпускаць добрую газету!

Самае прыкрае, што смілавіцкая баба Маня, якая даўно не была ў людскай лазні і за голасам якой выйшлі на паляванне прэтэндэнты, зноў застанецца падманутай. Бо якой дапамогі можна чакаць ад прафсаюза, а калі яна і паступіць, то ў каго будзе адабрана?

Смілавічы, дзе ў некалькіх інтэрнатах жывуць сотні навучэнцаў двух тэхнікумаў і вучылішча, няма не толькі лазні, але і замест бальніцы стаіць каркас-шкілет... І на гэтым пералік праблем не завяршаецца...

Яны будуць вечнымі, гэтыя прыкрыя праблемы, бо наша начальства звыклася з імі і вельмі ахвотна гуляе, скажам, у кадравыя гульні (пару месяцаў гадалі, хто сядзе ў "вертыкальнае" крэсла, а цяпер усе намаганні — на выбар свайго дэпутата: не дай Бог, каб чужынец не прайшоў!).

А патрабаванні законаў, указаў? Ды неяк прывыклі іх парушаць. І парушаюцца. Як у Чэрвені, так і ў іншых месцах.

Версии

Специнвестфонды — жертвы предвыборной борьбы?

Похоже, решение Президента о приостановлении действия лицензий, выданных всем 38 специализированным инвестиционным фондам (СИФам) республики, для последних было совершенно неожиданным.

Да, были попытки парализовать работу крупных инвесторов, но 30 марта в республике состоялся первый чековый аукцион. И уже на следующий день было обнародовано запретительное распоряжение главы государства и сотрудников крупнейшего в Беларуси Первого инвестфонда стали приглашать на беседу в УВД Мингорисполкома. Из-за такого нажима тот же Первый инвестфонд собрался на пресс-конференцию только 4 марта.

Это первый этап по сворачиванию реформ в Беларуси, — считает председатель правления фонда Александр Саманков. — По нашей информации, готовится еще ряд документов, которые ограничат деятельность и других субъектов негосударственной собственности. Скорее всего, будут отменены и результаты первого чекового аукциона.

Основная версия случившегося — искусственное нагнетание обстановки во время предвыборной борьбы с кандидатами-рыночниками. И, очевидно, вскоре последует обнародование компрометирующих подробностей работы отдельных специнвестфондов. Не исключали собравшиеся и скрытого противостояния работе СИФов крупных финансово-промышленных групп. Впрочем, все может быть гораздо проще: поставлена цель похоронить чековую приватизацию.

А пока 150 тысяч акционеров специнвестфондов оказались в неопределенном состоянии. Подавляющее большинство из них — пенсионеры, которым, по словам устроителей пресс-конференции, нанесен не только моральный, но и материальный ущерб, ведь выплата тех же дивидендов будет отложена. Пострадавшие специнвестфонды подписали даже обращения к Президенту и Верховному Совету с перечнем статей действующего законодательства, которым противоречит президентское распоряжение. Но, думаю, и сами авторы обращения не питают особых надежд на его отмену.

Юрий НОЯРОВИЧ.

Народная газета

РЕПОРТЕР УЗНАЛ

Завод оброс бронеломом

На доставшемся Беларуси в наследство от советского ВПК Борисовском танкоремонтном заводе в 6 раз снизился объем производства (принимая в расчет чисто военное направление деятельности).

Так, раньше на предприятии производилось 900 капитальных ремонтов бронетанковой техники в год, сейчас — лишь 150. А вместо двух с половиной тысяч дизельных двигателей восстанавливается только одна тысяча. В связи с этим завод вынужден приспосабливаться к новым условиям. У предприятия охотно покупают лесопожарные машины, вездеходы "Березина-1" и "Березина-2", аварийно-транспортные машины "Алеся", тягачи "Зубр" на базе танка.

В то же время немало сил и средств затрачивается предприятием на ликвидацию танков и бронированных боевых машин согласно Договору о сокращении обычных вооруженных сил в Европе. Первых уже порезано 1200, вторых — 686 единиц. До ноября 1995 года по этому же Договору предстоит уничтожить еще 868 танков и 440 боевых бронированных машин. Пока же, из-за отсутствия средств, по решению Президента их ликвидация приостановлена.

Сергей ВЕРЕЩАК.

Вот так "сэкономили"

В прошлом году на агропромышленных предприятиях Могилевской области от несчастных случаев пострадали почти 1600 человек, 16 из них погибли.

Но областные прокуратура и отделение Госинспекции труда убеждены: статистика не отражает истинную ситуацию. Эти органы, проверив агропромышленные предприятия, выявили 48 фактов сокрытия несчастных случаев на производстве. В колхозе "Родина" Глусского района, к примеру, пытались утаить 7 производственных травм из одиннадцати. Скотник С.Менделев из колхоза "Дубрава" Костюковичского района, получив перелом четырех грудных позвонков, перекрывая ветхий сарай, немало помыкался, пока доказал, что пострадал на производстве.

Сегодня техникой безопасности в агропроме области мало кто занимается. Должности инженеров по охране труда имеет лишь треть хозяйств. Остальные решили сэкономить. Хотели — на зарплате чиновников, а получилось — на здоровье и жизнях крестьян.

Николай ТОЛСТИК.

Колесить — так колесить!

К "полукругосветному" путешествию на велосипеде готовится житель деревни Большие Летцы (пригород Витебска) Валерий Гончаренко. 26-летний спортсмен с огромным опытом длительных велопробегов намерен пересечь 10 республик СНГ с запада на восток, а затем, добравшись морем до берегов Америки, прокатиться по США. Свой уникальный кросс Валерий посвящает 50-летию Победы и охране природы. Замысел гонщика одобрили областной спорткомитет и НОК Беларуси, поддержали многочисленные спонсоры. Гончаренко рассчитывает, что его вояж продолжится не более полугода.

Сергей ДВИНСКИЙ.

Аўтабіяэкалагічныя прытчы Анатоля КАЗЛОВІЧА

Беларусы паміж небам і зямлёй

Прытча 22. Як ЯНА і ЁН праз дваццаць пяць гадоў пасля сустрэчы пры дапамозе газеты знайшлі сваё каханне на чужой зямлі.

Напрыканцы 1993 года ў рэдакцыю фермерскай газеты "Новая зямля", якую выпускалі я і яшчэ два журналісты-аднадумцы, прыйшоў неардынарны ліст. Мы яго надрукавалі. І тым, як высветлілася далей, паспрыялі незвычайнай гісторыі жанчыны і мужчыны.

Мужчынская споведзь:

"... Жыву ў Мінску, ужо дзед, на адказнай рабоце, але, дзякуй Богу, не начальнік. Як усе, ужо неяк прызвычаіўся да Чарнобыля. Чалавек да ўсяго прыстасоўваецца, гэта, можа, і няблага, і трэба. Ва ўсялякіх умовах трэба чалавеку выжыць, для гэтага трэба супакоіць нервы. Вось мы, беларусы, і аберагаем самі сябе ад Чарнобыля тым, што забываем пра яго, быццам ён нас не тычыцца.

Паўтара месяца назад, у канцы кастрычніка 1993 года, я ішоў па вуліцы Чырвонаармейскай, там спуск уніз, брусчатка, заўсёды стаяць аўтобусы з абласнымі нумарамі. Туды, у інстытут радыяцыі, прывозяць чарнобыльскіх дзяцей на праверку. Месца гэтае ведаюць у Мінску і ў Беларусі ўсе.

Іду і бачу, як заўсёды, аўтобус, а каля яго немаладую жанчыну з хлопчыкам гадкоў пяці. І я адразу яе пазнаў. Прайшло 25 гадоў, як яе не бачыў, а пазнаў, быццам развіталіся ўчора.

Было тое ў 1968 годзе. Мяне паслалі ў камандзіроўку ў Брагінскі раён Гомельскай вобласці, у гарадок Камарын. Мясцовыя хлопцы запрасілі на рыбалку. Паехалі на грузавіку ў канцы дня. Хлопцы ў кузаве, мяне як сталічнага госця пасадзілі ў кабіну. З намі паехала дзяўчына. Прыгожая! Гадоў дзевятнаццаць, настаўніца малодшых класаў. У цеснай кабіне сядзелася нам цесна, а таму добра. Нешта гаварылі, не памятаю, і паміж намі ўзнікла пачуццё, нас пацягнула адно да другога. Кожны чалавек, мужчына і жанчына, па сабе ведае, якія цудоўныя гэтыя мінуты.

Рыбу лавілі ў рэчцы Брагінцы. Лавілася добра. Было цёпла, вечарам кветкі на беразе моцна пахлі. Мы лавілі сеткай, браканьернічалі. Ішлі каля берага па горла ў вадзе, плынь была адчувальная, нават валіла з ног. Яна ішла па беразе, па тых кветках, смяялася, глядзела на мяне, як я боўтаўся ў цёплай вадзе.

Агонь расклалі ў цемнаце. Пачысцілі рыбу, паставілі юшку. Бегалі па траве, куляліся. Маладыя ж! Ноч была ясная, зіхацела і шапацела. Я ўвесь час бачыў яе, дзяўчыну. Яна задуменна сядзела, глядзела на агонь.

Пад юшку выпілі. Пакуль выпівалі, елі і хвалілі юшку, насунулася нечаканая навальніца. Маланкі, гром, лівень. Вогнішча патухла. Усе вымаклі да ніткі.

Хлопцы палезлі ў кузаў ехаць дамоў, а мяне — у кабіну. Яна зноў са мной. Едзем, ніколі не забуду, бліснула маланка, асвяціла масток праз Брагінку, тут я яе пацалаваў. Яна як чакала. Мы пачалі цалавацца прагна, не звяртаючы ўвагі на шафёра, пажылога дзядзьку.

Лівень б'е па шкле, хлопцы наверсе на ўсё горла нешта спяваюць, а мы страцілі галовы. Шафёр спыняе машыну, кажа мне, не гледзячы ў наш бок: "Не чапай яе. У яе хлопец там, у кузаве мокне. Ты паедзеш адсюль, а ёй тут век трэба пражыць, каб усё добра было. Ідзі ахалонь!"

Я палез у кузаў. А заўтра ранічкай паехаў у Мінск. Страшэнна хацеў пабачыць яе, ды дурасць не пусціла. Потым не раз шкадаваў, бо не мог забыць яе...

Яна мяне адразу пазнала. Крыху пасядзелі ў скверыку на Чырвонаармейскай. Яна была з унукам. Хлопчык хварэў. Нарадзіўся ж у Брагінскім раёне, а там — вядома, як пасля Чарнобыля.

Расплакалася, калі расказвала пра сябе. Тады, пасля маіх уцёкаў, з яе смяяліся. Хацела кідаць школу, збегчы куды вочы глядзяць. А куды? Сірата ж. Выйшла замуж за таго, хто ў кузаве спяваў і ведаў, што робіцца ў кабіне. Ён не мог даравиць, біў яе. Спіўся. Шчасця з ім так і не было.

У 1989 годзе іх перасялілі ў Гродзенскі раён. Яе з мужам, сям'ю дачкі з хворым хлопчыкам. Яго трэба было ратаваць за граніцай. Грошай на аперацыю не мелі. Не ведалі, што рабіць.

Прызнаюся вам, Анатоль Мікалаевіч, як роднаму чалавеку, бо вы таксама прычасціліся Брагінкай, я чытаў у вашай кнізе. Вы мяне зразумееце. Як пасадзіў яе ўнука, Ванечку, сабе на калені, прыціснуў да грудзей яго галоўку — раптам успомніў пах кветак на Брагінцы, дзе зараз нялюдская зона. Не вытрымаў, заплакаў, што ў яе не склалася жыццё, што я ўцёк ад шчасця, не паклікаў яе, а каб яна была са мной, то ў яе жыцці не здарылася б Чарнобыля. Я вінаваты перад ёю за ўсё. Таму і ў маёй сям'і не гладка, не соладка.

Калі яна прачытае вашу газету, то зразумее, хто напісаў.

Даруй мне!"

Газета "Новая зямля" мела тыраж усяго 10 000 экземпляраў. Нейкім цудам знайшла менавіта тую жанчыну-перасяленку. Яна прыслала мне ліст. Да таго часу фермерскі функцыянер К.Ярмоленка нашу незалежную рэдакцыю разагнаў, набраў паслухмяную. Жанчына з рэчкі Брагінкі ўбачыла, што "Новую зямлю" падпісваю не я, і пасылаць туды сваю споведзь не адважылася. Праз Саюз пісьменнікаў даведалася мой адрас і палічыла неабходным падзякаваць мне... за сваё шчасце. Быў я чужым людзям ні сват ні брат, а зрабіўся, як бачыце, духоўным бацюшкам.

Жанчыны пішуць больш падрабязна, чым мужчыны. Ліст чарнобыльскай перасяленкі вялікі, у многім паўтараў тое, што мы ўжо ведаем. Кветкі на беразе Брагінкі, зорная ноч, лівень, маланка, масток, пацалунак... Калі б не існавала ўсяго гэтага, ЁН і ЯНА забылі б адно другога. Прырода выратавала іх каханне. А газета, як маланка, асвятліла іх масток да новай сустрэчы.

Праз газету яны абое ўбачылі сябе быццам збоку — і зразумелі сваю страту. Хто ведае, ці адбылася б іх наступная сустрэча, калі б нешта не штурхнула яго падзяліцца сваім пакаяннем са мной, напісаць тое, што я цытаваў вышэй. Чым толькі ні прыходзіцца займацца журналісту ў грамадстве, у якім адсутнічаюць паўнацэнныя грамадскія і дзяржаўныя інстытуцыі па рэгуляванню ўзаемаадносін людзей! Прызнаюся, роля духоўнага зводніка больш прыемная, чым роля суддзі ў канфліктах палітызаваных сучаснікаў — ад дзяржаўных мужоў да суседзяў-дачнікаў.

Жаночая споведзь:

"Развітаўшыся ў скверыку, мы не абмяняліся адрасамі. Навошта? Жыццё, лічы, пражылі, былога не вернеш.

І ўсё ж я не здзівілася, калі праз месяц атрымала яго пісьмо. Значыць, сэрца маё чакала. Як, спытаеце вы, Анатоль Мікалаевіч, ён мяне знайшоў? Праз Ванечку. Пайшоў у рэгістратуру, Ванечка там адзіны з раёна. Так даведаўся, дзе я жыву.

У Германіі ў яго даўні сябра. Дык той сабраў у знаёмых грошай, марак сваіх, і нас запрашаюць: вязіце Ванечку на лячэнне. Дачка паехаць не змагла, выпала мне. Паехала бабка на чужыну і знайшла любоў.

Калі ад'язджалі, я ведала, што з намі здарыцца ў Германіі. Ён жа ўзяў водпуск, паехаў з намі. Без яго мы не знайшлі б таго немца.

Было якраз лета, цёпла. Немец павёз нас усіх на рэчку на пікнік. Ванечку ўжо выпісалі, паехаў з намі. Рыбу ніякую не лавілі, купілі ў магазіне. Заседзеліся на рэчцы, здаецца, Хунка, так звалі немцы. У цемнаце мы з ім пайшлі па беразе. Вада цурчэла недзе ў траве, пахла кветкамі, як на Брагінцы. Ён мяне папрасіў: можна цябе пацалаваць?

Усё ў нас было ўпершыню. Мы зноў, як тады ў кабіне, страцілі галовы..."

Сітуацыя, як кажуць, патрабуе не каментарыяў, а заклінанняў:

Няхай адродзіцца і струменіць беларуская Брагінка, каб у акіяне зліцца з нямецкай Хункай!

Няхай папраўіцца Ванечка!

Няхай газеты лётаюць паміж людзьмі, як неприручаныя птушкі, і не ведаюць амбіцыёзных, недалёкіх гаспадароў!

Няхай ЯНА і ЁН сустрэнуцца зноў!

Пажарнікі спаборнічаюць





1—2 красавіка ў закрытым спартыўным манежы Мінскага вышэйшага пажарна-тэхнічнага вучылішча прайшоў міжнародны турнір па пажарнаму спорту на прыз майстра спорту міжнароднага класа Вячаслава Нямілава. У спаборніцтвах прынялі ўдзел 16 каманд з Беларусі, Расіі, Украіны, Літвы. Першае месца заваявала каманда Екацярынбурга. Першая мінская каманда заняла другую ганаровую прыступку.

❑ Моманты спаборніцтваў;

❑ каштоўны прыз за лепшыя вынікі ў спаборніцтвах атрымаў мінскі спартсмен Віталь Вандышаў;

❑ Вячаслаў Нямілаў, імя якога носіць турнір, першы ў Беларусі майстар міжнароднага класа. Дзесяць разоў запар узнімаўся ён на вышэйшую прыступку гонару ў розных спаборніцтвах міжнароднага і саюзнага ўзроўню.



Марыя ЖЫЛІНСКАЯ,
фота аўтара.

Са стрэльбай... па дывідэнды

Да мільёнаў акалпачаных жыхароў Масквы, якіх спакусілі казачнымі працэнтамі дывідэндаў, дабавілася дзесяць тысяч новых ахвяр.

Шырока разрэкламаваная ў друку фірма "Залаты стандарт", атрымаўшы ў дзяржаўных чыноўнікаў усе неабходныя юрыдычныя дакументы, за кароткі час сабрала 10 мільярдаў рублёў. Потым яе "кіраўніцтва" знікла з маскоўскага небасхілу. Устрывожаныя ўкладчыкі грошай звярнуліся да міліцыі. Але было позна, бо аферысты дзейнічалі аператыўна і па загадзя складзенаму плану. Зняўшы ўсе грошы з рахункаў камерцыйных банкаў, фірмачы "зрабілі прастачкам ручкай". Ёсць міліцэйская версія, што новы расійскі мільярдэр з кампаніяй, удала пераняўшы вопыт крымінальнага бізнесу, знайшоў сабе часовы прытулак у адной з былых савецкіх рэспублік. І "залёг там на дно"... А мільёнам падманутых кліентаў дзяржава не зможа нічым дапамагчы, колькі б яны ні мітынгавалі, колькі б ні стваралі "партый падманутых".

Відаць, гэтая сумная і даволі банальная гісторыя расійскага дзікага рынку штурхнула аднаго з кліентаў прыватнай фінансавай фірмы на незвычайны крок. Некалькі дзён назад трыццацічатырохгадовы мужчына, узяўшы з сабой паляўнічую стрэльбу, з'явіўся ў офіс да кіраўнікоў фірмы, якой ён даверыў свае зберажэнні пад шчодры працэнт. Стрэліўшы дуплетам у столь памяшкання, ён запатрабаваў неадкладна выплаціць яму не толькі дывідэнды, але і ўсю суму ўклада. Пакуль жонка атрымлівала 27 мільёнаў "крэўных", муж дзяжурыў са стрэльбай ля ўваходу ў офіс. Перад яго рашучасцю нават спасавала група амонаўцаў, якія прыехалі да офіса па выкліку кіраўнікоў фірмы. Але як толькі жонка з грашыма паехала дадому, няўдалы кліент здаўся міліцыі.

Леанід ФАДЗЕЕЎ,
уласны карэспандэнт "Народнай газеты" ў Маскве.

Ну і ну!

Рука прафсаюза ў кішэні студэнта

Шаноўны рэдактар! Не магу не расказаць Вам гэтую гісторыю. Студэнты педінстытута стварылі суполку свабоднага прафсаюза. Каб папаўняць свае шэрагі, пайшлі з агітацыяй да першакурснікаў, мяркуючы, што тыя яшчэ да прафсаюза не далучаны. "А ў нас, — агаломшылі агітатараў першакурснікі, — ужо з верасня, з першай стыпендыі ўтрымліваюць прафсаюзныя складкі". — "У які ж прафсаюз?" — "Не ведаем". — "А вы падавалі заявы аб уступленні ў прафсаюз?" — "Не. У нас і не пыталі".

Калі мне гэта расказалі, я, здзіўлены не менш за студэнтаў, зайшоў да галоўнага бухгалтара інстытута К.Зенавай па тлумачэнні.

"Ёсць загад абкама прафсаюза аб утрыманні складак праз бухгалтэрыі", — паведаміла мне Кацярына Дзмітрыеўна. "Але ж, па-першае, вы падпарадкоўваецеся рэктару інстытута, а не абкаму прафсаюза, а па-другое, абкам якога прафсаюза выдаў такі цікавы загад?" — "Я ведаю толькі адзін прафсаюз!" — "Мабыць, гэта той, у які вы самі ўваходзіце. Але ж чаму вы забіраеце ў свой прафсаюз грошы тых студэнтаў, якія ў ваш прафсаюз не ўваходзяць?" — "Хай напішуць заяву аб тым, каб мы не ўтрымлівалі з іх складкі". — "Навошта ж такая заява? Яны ж не пісалі заявы аб уступленні ў прафсаюз!" — "Звяртайцеся да Дудзіна". (М.В.Дудзін — старшыня Магілёўскага аблсавета прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі.) — "Але ж я не думаю, каб ён загадаў вам рабаваць усіх без разбору дзеля папаўнення бюджэту "ўласнага прафсаюза". — "Я з вамі ў такім тоне размаўляць адмаўляюся". На тым наша размова і скончылася.

Расказваючы пра гэта сваім знаёмым, я пачуў і такое: "А мая дачка вучыцца ў педвучылішчы. Ёй пятнаццаць гадоў, яшчэ непаўналетняя. Але ім у вучылішчы сказалі, што калі не прынясуць фота для прафсаюзнага білета, то стыпендыю выплачваць не будуць".

Вось так-так! Застаецца сесці за камп'ютэр і падлічыць, колькі ў Беларусі навучэнцаў ВНУ, тэхнікумаў, ПТВ і іншых навучальных устаноў са стыпендыяй, колькі ўвогуле грошай выплачваецца ім у якасці стыпендыі і колькі складае ад гэтай сумы адзін працэнт, які, не пытаючыся ў стыпендыятаў, забіраюць ад іх на пракорм прафсаюза.

Ці не пара спыніць такое рабаўніцтва? Не дай Бог, і ў іншых прафсаюзаў з'явіцца такі ж апетыт! Студэнты ўсіх не пракормяць. Пашкадуйце дзяцей!

Міхась БУЛАВАЦКІ,
старшы выкладчык Магілёўскага педагагічнага інстытута.

"ЧОРНЫЯ ДЗІРКІ" ЗАКОНА

Банкаўскія аферы

Міхаіл ГАРДЫКА,
старшы следчы па асабліва важных справах Пракуратуры Рэспублікі Беларусь

У апошнія гады наша грамадства захліснулі размовы і прамовы пра мафію, асабліва ў сферы эканомікі. У ходзе перадвыбарнай барацьбы ўсё часцей гучаць трывожныя папярэджанні: мафія рыхтуецца перасесці ва ўладныя крэслы, купляць выбаршчыкаў і магчымых дэпутатаў. Аднак да сённяшняга дня ніхто гэтых буйных "мафіёзі" так і не бачыў, ніводзін з іх не апынуўся на лаве падсудных. Так, час ад часу пападаюцца ў рукі праваахоўных органаў асобныя махляры, якія спрытна прыстасаваліся да эканамічнага бязладдзя. Чаму?

Галоўная прычына ў тым, што праваахоўная сістэма аказалася проста непадрыхтаванай да нечаканага ўсплёску эканамічнай злачыннасці. Следчым не хапае спецыяльных ведаў (вучыцца даводзіцца па ходу справы), аргтэхніка — на ўзроўні 70-х гадоў і галоўная бяда — адсутнасць усеахопнай, дакладнай і эфектыўнай заканадаўчай базы.

Работнікі Пракуратуры толькі зусім нядаўна заняліся ўшчыльную злачынствамі ў банкаўскай сістэме (раней камерцыйных банкаў проста не было). Адну з такіх спраў расследую цяпер і я. Чым больш вывучаеш матэрыялы, тым больш пераконваешся, якая анархія пануе тут. Выяўляецца неверагоднае: у нас ёсць закон, як атрымаць крэдыт, але няма такога, каб гарантавана і ў тэрмін гэты крэдыт дзяржаве вярнуць. Зразумела, асобных махляроў можна пасадзіць за краты, аднак мільярды рублёў страчаны для дзяржавы назаўсёды.

Прывяду адзін з эпізодаў шматлікіх банкаўскіх афер. Шэф некалькіх камерцыйных фірмаў (прозвішча называць не буду, паколькі справа да суда яшчэ не дайшла) згаварыўся з некалькімі іншымі "крутымі" прадпрымальнікамі, каб выманіць крэдыты, перавесці іх у валюту і зажыць не па-савецку, дзе-небудзь далей ад шчодрай радзімы.

За кароткі тэрмін у "Белбізнесбанку", "Прыорбанку", "Энергабанку", "Белпрамбудбанку", акцыянерных камерцыйных банках "Поиск", "Беларусь" ён лёгенька атрымаў больш як мільярд рублёў і дзесяткі тысяч долараў ЗША. Было гэта яшчэ ў 1993 годзе. На сённяшні дзень ён павінен вярнуць (ужо пасля дэнамінацыі) больш за 500 мільёнаў рублёў і каля 400 тысяч долараў ЗША, хоць павінен быў зрабіць гэта даўно.

Ніякай дзейнасцю, акрамя "пракручвання" грошай, гэтыя ліпавыя фірмы не займаліся, аднак крэдытадаўцы, падобна, гэтым і не цікавіліся. У дагаворах банкі нават не забаранялі яму аб'ядноўваць сродкі з іншымі камерсантамі для цьмяных мэтаў без іх дазволу. Ніхто не цікавіўся, ці ўвогуле здольны гэты "фірмач" такія грошы вярнуць і якой маёмасцю валодае. Часам банкі выдаюць сотні мільёнаў рублёў крэдытаў прыватным фірмам са статутным фондам усяго 40—50 тысяч рублёў. Адкуль такая "дабрачыннасць", можна толькі здагадвацца, але яна нармальна ўпісваецца ў рамкі нашага аморфнага заканадаўства.

Наспеў час стварыць аналітычны цэнтр, які б валодаў усёй інфармацыяй аб крыніцах даходаў фірмаў і іх заснавальнікаў, аб памерах выдаваемых крэдытаў і своечасовасці іх вяртання і г.д. Тады не было б такога, што, не вярнуўшы адну пазыку, прадпрымальнік бесперашкодна атрымлівае і другую, і трэцюю. Нельга сёння абысціся без іпатэкі і залогавага права. Каб крэдыты выдаваліся пад канкрэтна існуючыя каштоўнасці, а не толькі пад хісткія гарантыі страхавых кампаній, якія самі могуць ліквідавацца.

І апошняе, на што хацелася б звярнуць увагу, — гэта арганізацыйныя няўвязкі ў барацьбе з эканамічнай злачыннасцю. Галоўная асоба ў расследаванні справы — следчы. Менавіта на яго павінны працаваць аператыўныя службы ў рамках канкрэтнай крымінальнай справы. Ён павінен атрымліваць у пісьмовым выглядзе ўсю інфармацыю без расшыфроўкі крыніц, якая хоць і не трапіць у суд, але дасць следчаму магчымасць ведаць, хто і як спрацаваў. Між тым нярэдка такая інфармацыя праходзіць міма яго, складваецца ў папкі і пасля знішчаецца. Да таго ж знаёміцца з ёю маюць магчымасць многія міліцэйскія чыны, і ўцечка інфармацыі амаль непазбежна. Сам жа следчы да яе не дапускаецца з-за сакрэтнасці. Гэта дазваляе злачынцам своечасова "рабіць ногі", а аператыўным службам — хаваць сваю бяздзейнасць ці злоўжываць службовым становішчам, прадаючы такія звесткі зацікаўленым асобам.

Відавочна, што, пакуль мы не навядзём парадак ва ўзаемаадносінах праваахоўных органаў, пакуль не залатаем "чорныя дзіркі" ў заканадаўстве, далёка наперад у барацьбе з эканамічнай злачыннасцю прасунуцца не ўдасца.

Сатирическим пером

Не в деньгах счастье!

Виктор ЛЕЩЕНКО

Странные события происходят в родном Отечестве — банки грабят все кому не лень, но, похоже, это никого не волнует.

Два года назад выпускник института Игорь Хивук уехал из родной Алма-Аты, оставив там сладкие, как сок апельсина, дни детства и взбешенного ростовщика, которому задолжал 120 тысяч долларов. Прибыл в Минск. Тут жил его двоюродный брат-тезка, который, правда, денежных тузов не обирал, а честно и преданно слепил глаза над микросхемами и грезил о солнечных пляжах и стройных ножках. Но с приездом брата в его минской квартирке канифольный запах моментально выветрился и в ней запахло большими деньгами.

Гость из Казахстана, ознакомившись с экономической ситуацией в республике, пришел к печальному выводу, что здесь особенно не развернешься. Единственная возможность — пощупать банки.

Подготовка к этой процедуре заняла почти полгода. Однако затраты того стоили. Нет, пришелец из Азии не стал скупать оружие, собирать наемников и разрабатывать детали взятия банка посредством артобстрела и бомбардировки с воздуха. Банки он собирался взять в белом костюме и галстуке.

Сперва два брата зарегистрировали в исполкомах столицы пять фирм — "Лесник", "Короден", "Роди", "Пиастр плюс" и "Пятый".

Через пару месяцев в просторном кабинете начальника кредитного управления одного минского банка появился одетый с иголочки молодой человек с выражением лица, напоминающим портрет на денежной купюре. После вступительных слов и выказывания уважения гость из Алма-Аты сказал:

— Дело хочу провернуть полезное и прибыльное, партнеры аплодируют, но из-за нехватки финансов товара на сцене пока нет. Подсобите кредитом.

Так как банки в Минске просто изнывают от избытка денег и дают кредиты любому работяге на строительство того же жилья, то бессребренная просьба "чужестранца" была принята с радостным шуршанием.

И 5 января рублевая плотина Хивукам была торжественно открыта. Банк "Олимп" в числе первых перечислил 200 миллионов рублей доселе неизвестной фирме "Короден". Не остались в стороне и другие инвесторы — банк "Комплекс" расщедрился на 22 тысячи долларов, "Белвнешэкономбанк" пожертвовал 240 миллионов рублей, а банк "Беларусь", решив — гулять так гулять, дал 300 миллионов. В итоге братьям удалось собрать порядка 2 миллиардов "деревянных". Страховку обеспечивали такие известные компании, как "Кентавр", "Белгосстрах" и другие.

Плотина просуществовала ровно месяц. А затем все куда-то исчезло, испарилось, словно это был невероятный сон. В память о великом заграничном фокуснике остались его потрепанный паспорт, личная фотография с надписью "Не в деньгах счастье" и пять фирм со счетом чистым, как стол на картине "Утро безработного".

Если вы, дорогой читатель, думаете, что подобная пропажа миллиардов привела банкиров к безутешной депрессии и несварению желудка, то вынужден сказать, что это не так. Пища по-прежнему в радость и потери словно никто не заметил (кредиты все равно банкам вернули, но уже, правда, страховые компании, которые в свою очередь могут заштопать образовавшуюся дыру, подняв расценки на свои услуги для фирм, которые также ...). Как заметил начальник следственного отдела Партизанского РОВД столицы Николай Конокоров, денежные фокусы, становясь едва ли не массовыми, наводят на мысль, что это происходит не спроста и ссуды не возвращаются не потому, что люди, просидевшие всю жизнь на деньгах и привыкшие говорить скорее "нет" чем "да", потеряли квалификацию, а потому, что такие исчезновения приносят, видимо, неплохие дивиденды и подобное положение некоторых устраивает.

На сегодня следствие столкнулось с преградой: трудно определить конкретные пути обналички тех миллиардов (необходима помощь финансистов, но, как говорит следователь, ведущий это дело, можно засыпать банкира повестками, однако он скорее продаст последний "Мерседес", чем явится на допрос, в лучшем случае — пришлет какого-то клерка).

Где сейчас братья Хивуки, неизвестно. Можно лишь предположить, что они скорее всего под другими фамилиями дают новые иллюзионистские представления в каком-то городке, снимают свои барыши и планируют очередные гастроли. Но почему банкиры им столь охотно помогают?

СТАЛА ВЯДОМА

Своечасова не паспеў — плаці сам

